***Новак В. С.***

# ВЯСЕЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ ГОРАДА ГОМЕЛЯ

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*

*(Паступіў у рэдакцыю 10.03.2022)*

Прапанаваная тэма даследавання звязана з важнай тэарэтычнай праблемай сучаснай фалькларыстыкі – рэгіянальна-лакальным вывучэннем фальклору. Як слушна адзначыла В.М. Шарая, «у межах рэгіянальнага падыходу да вывучэння фальклору любая мясцовая культура прадстаўляецца як нешта самакаштоўнае, што заслугоўвае спецыяльнага даследавання» [1, с. 470]; «Рэгіянальны фальклор, вусна-паэтычная творчасць пэўнага рэгіёна, якая ў той ці іншай ступені адрозніваецца ад агульнаэтнічнага фальклору і вылучаецца самастойнасцю, аўтаномнасцю, характарызуецца наяўнасцю універсалій, уласцівых для канкрэтнай мясцовасці. Улік сукупнасці ўсіх рэгіянальных фактараў (вытворчага, сацыяльна-гістарычнага, этнічнага, генетычнага, кантактнага і інш.) надзвычай важны для разумення рэгіянальнага фальклору <…> Цэласнае ўяўленне аб развіцці народнай культуры, якая паводле сваёй прыроды паходжання і функцыянавання мае рэгіянальна-лакальны характар, немагчыма без канкрэтных назіранняў за творчым жыццём фальклорных традыцый у межах пэўнай вёскі, раёна, вобласці» [1, с. 470].

Вывучэнне традыцый вясельнай абраднасці беларусаў, у якой знайшлі адлюстраванне такія культы, як прыродна-касмічны, ушанаванне продкаў і працяг роду, надзвычай перспектыўна для разумення менталітэту народа. У якасці аб’екта даследавання абраны экспедыцыйныя фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, запісаныя падчас шматлікіх экспедыцый у горадзе Гомелі.

Вясельны абрадавы комплекс беларусаў надзвычай складаны па структуры, кожны з вясельных перыядаў (давясельны, уласна вясельны, паслявясельны) уключае шматлікія абрадавыя этапы, якія вылучаюцца адметнымі рытуаламі і песнямі, прыкметамі і павер’ямі. Вясельная абраднасць горада Гомеля, як сведчаць фактычныя матэрыялы, уяўляе сабой своеасаблівы кангламерат розных мясцовых вясельных традыцый, носьбітамі якіх з’яўляюцца не толькі гамяльчане, але і жыхары з розных вёсак Добрушскага, Гомельскага, Лоеўскага, Веткаўскага, Рагачоўскага, Кармянскага, Хойніцкага і іншых раёнаў Гомельскай вобласці, а таксама прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей, найперш рускія і ўкраінцы.

Засяродзім увагу на давясельным перыядзе, які займае важнае месца ў сістэме вясельных абрадаў, звычаяў і песень беларусаў. Зыходзячы з этнаграфічных апісанняў вяселля, у сваты часцей за ўсё прыходзілі сват з бацькам жаніха, мэта прыходу якіх агучвалася ў форме іншасказальнага дыялогу. Як правіла, у ролі свата выступаў мужчына, які карыстаўся павагай: *«Хадзілі ў сваты, калі хлопец з дзеўкай ужо дамовіліся паміж сабой. Сваты прыходзілі з хлебам-соллю, з гарэлкай. Выбіралі ў сваты самых паважаных людзей. Сваты пачыналі здалёк: "У нас ёсць купец-маладзец, у вас на прадажу ёсць цялушка-палушка. Ці не прадасцё нам?"»* (зап. А. Кучаравай у г. Гомелі ад Кацярыны Цімафееўны Рабыкінай, 1942 г. н., пражывала ў п. Васток Веткаўскага р-на)[1]. Вырашэнне пытання аб згодзе або нязгодзе нявесты на шлюб суправаджалася пэўнымі сімвалічнымі дзеяннямі. Напрыклад, калі нявеста пагаджалася выйсці замуж, то *«павязвала сватам ручнікі. І па паводзінах бацькоў бачылі, згодныя яны ці не»* (зап ад К. Ц. Рабыкінай у г. Гомелі), выносіла сватам падарункі: *«Калі нявеста саглашаецца, яна дорыць падарункі: каму платочак, ручнік. А тыя ў адказ кладуць грошы нібы выкуп»* (зап. ад Уладзіславы Антонаўны Белакаваленка, 1922 г. н., у г. Гомелі). Калі дзяўчына адмаўлялася выходзіць замуж за хлопца, то *«значит она не выносила полотенце сватам. Обычно»* (зап. у г. Гомелі ад Надзеі Дзямідаўны Кальковай, 1940 г. н., пражывала ў в. Уваравічы Буда-Кашалёўскага р-на).

У вясельнай абраднасці беларусаў, як было ўжо адзначана вышэй, важнае значэнне надавалася менавіта адорванню сватоў падарункамі: *«Обычно, если она (невеста) соглашалась, то сватов обвязывали полотенцем, а матери выносили кусок ткани»* (зап. у г. Гомелі ад Антаніны Мікалаеўны Сявуцкай, 1925 г. н., пражывала ў в. Маркавічы Гомельскага р-на). Паводле сведчанняў жыхаркі горада Гомеля Аляксандры Іванаўны Дрончанка, 1922 г. н., перасяленкі з вёскі Чахі Хойніцкага раёна, калі ехалі сватацца да нявесты, якая захавала цнатлівасць, то абавязкова абвязвалі бутэльку з гарэлкай чырвонай ніткай або стужкай, у адваротным выпадку – сіняй: *«Жаніх сабірае сваіх радзіцелей і прыяжджае ка мне ў сваты. Хлеб прывозілі. І бутылачку прывозілі. І красную нітачку завязваюць на бутылку ці лентачку. Гавораць, калі красную завязваюць, калі ідуць да дзевачкі, то гэта дзевачка чэсная. А калі не красная лентачка, то гэта пазор на ўсю*

[1] У артыкуле выкарыстаны матэрыялы архіва навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры рускай і сусветнай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны.

*дзярэўню. Так паложена. А калі на бутылку завяжуць сінюю лентачку, то гэта дзеўка ўжэ не чэсная была».*

Важнае значэнне ў беларускай вясельнай традыцыі надавалася пасагу нявесты. Напрыклад, паводле сведчанняў інфармантаў, *«у дзень вяселля дружкі нараджалі нявесту, гатовілі прыданае. Прыданае – вялікі сундук, гэта было вельмі важна. Калі была сваха, то аглядала прыданае – колькі ручнікоў наткана, пярыну, пасцелю»* (зап. ад Кацярыны Цімафееўны Рабыкінай у г. Гомелі).

У сістэме вясельнай абраднасці беларусаў, у прыватнасці жыхароў горада Гомеля, абрадавы этап развітання маладой з сяброўкамі вядомы пад назвамі «зборная субота» («суборная субота»), «дзявошнік», «дзявочнік» і іншымі: *«За дзень перад вяселлем дзяўчына гатуе вячэру ў сябе дома і збірае ўсіх сваіх сябровак <...> На працягу ўсёй вячэры дзяўчыны ўспамінаюць усе лепшыя і цікавыя моманты іх жыцця, якія яны праводзілі разам, п'юць за салодкае жыццё будучай нявесты, даюць ёй розныя парады. Дзявочнік сімвалізуе развітанне са свабодным жыццём і ўступ у новае – сямейнае»* (зап. ад Алены Мікалаеўны Шуманавай, 1980 г. н., у г. Гомелі). Менавіта «вясельны вянок рыхтавалі ў Суборную суботу. Гэты абрад быў своеасаблівай мяжой, якая аддзяляла дашлюбнае жыццё дзяўчыны ад яе будучага сямейнага жыцця. У гэты вечар маладая развітвалася з сяброўкамі, прасіла ў іх прабачэння, апошні раз заплятала касу – сімвал дзявоцтва» [2, с. 298]. Сярод абрадавых дзеянняў зборнай суботы, паводле ўспамінаў жыхаркі горада Гомеля, якая пражывала раней ў вёсцы Свяцілавічы Веткаўскага раёна, вылучаўся рытуал «завівання ёлачкі»: *«У суботу перад свадзьбай нявеста звала сваіх падружак “віць ёлку”. Украшалі эту ёлку цвяточкамі і ставілі ў места, штоб ніхто не відзеў»* (зап. ад Тамары Фёдараўны Ермаковай, 1937 г. н.). Пра звычай «ёлку везці» і міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з імкненнем сарваць кветку з ёлкі, каб забяспечыць сабе ў будучым шчаслівы лёс, паведаміла жыхарка горада Гомеля Кацярына Цімафееўна Рабыкіна, ранейшым месцам жыхарства якой быў пасёлак Васток Веткаўскага раёна: *«Дружкі вечарам перад вяселлем нараджалі “ёлку”, яе пратaлі, “ёлку” ніхто не должэн быў бачыць. Украшалі цвятамі бумажнымі каляровымі. Пасля моладзь старалася, калі “ёлку” вязлі, цвяток сарваць: хто сарве, той будзе шчаслівы. Таму яе дружкі трымалі высока-высока, крэпка. Гэта называлася “ёлку везці”. “Ёлку” трэба было давезці цэлую. Патом гэтую “ёлку” станавілі перад маладымі на кут, утыкалі яе ў булку хлеба з пшанічнай мукі, хлеб перавязвалі краснай лентай. Спявалі:*

*Ой, ты, ёлачка барава, барава,*
*У бару стаяла, шумела,*
*Дарогаю ішла – звінела, звінела.*
*На стале стаяла – засіяла, засіяла,*
*Ой, ты, ёлачка кучаравая».*

Іншы раз, калі дружкі маладой упрыгожвалі «ёлку», то спецыяльна на яе верхавіну таксама вешалі кветкі, здыманне якіх абазначала, што маладая павінна ўжо была пакінуць родны дом, развітацца з бацькамі: *«А яшчэ так рабілі: калі прыязджаў маладым, нараджаюць елку. На самую макаўку вешаюць кветак букет. І калі яго не знімаюць, маладую не аддаюць»* (зап. ад У. А. Белакаваленка ў г. Гомелі).

Заслугоўваюць увагі ўспаміны жыхаркі горада Гомеля Алены Кузьмінічны Карпінскай, 1917 г. н. (нарадзілася ў в. Перапісь Гараднянскага р-на Чарнігаўскай вобл.), звязаныя з момантам, калі ў хаце маладой ішла падрыхтоўка да вяселля: *«Вось часа ў чатыры-пяць вечара прыходзілі "віць ельца". Срубывалі невялікую вішню, потым з цвятной бумагі рабілі кветкі, украшалі ім, і гэтае "ельца" потым ставілі на стол маладых».*

Паводле ўспамінаў інфармантаў, абрад вянчання на тэрыторыі Гомельшчыны не меў шырокага распаўсюджання. Сустракаюцца рэдкія сведчанні адносна яго правядзення, калі надзвычай важнымі былі такія моманты, як звязванне рук маладых і падкладванне ручніка пад іх ногі: *«Батюшка платком связывал руки молодым, а потом покрывал их руки своим передником, брал за руки молодых и шёл впереди. Над ними несли венец первые друзья, а батюшка молился, потом венцы брали другие друзья, а в конце брала опять первая пара. Под венец молодые стали на полотенце, так что могли стать только они, потом ехали на конях с колокольчиками врозь, это когда в церковь, а домой – вместе»* (зап. ад Ніны Пятроўны Конухавай, 1942 г. н., у г. Гомелі).

Падрыхтоўка абрадавага печыва – важны структурны кампанент вясельнага абрадавага комплексу беларусаў. Пачатак уласна вясельнай часткі быў звязаны менавіта з рытуаламі выпечкі гэтага галоўнага абрадавага хлеба – каравая, які сімвалізаваў багацце і дастатак маладых у шлюбе, што знайшло надзвычай паэтычнае адлюстраванне ў сведчаннях Таццяны Рыгораўны Гаўрылавец, 1933 г. н. (пражывала ў в. Лужок Кармянскага р-на): *«Каравай – шлях у рай»* (зап. у г. Гомелі). «Міфалагічная сімволіка каравая надзвычай багатая: ён сімвал маладых, сонечнага бажаства, нябеснага сямейства, дабрабыту і ўрадлівасці, багацця, шлюбнага саюзу, даўгалецця, добрай долі,

дзетнасці» [2, с. 648]. Невыпадкова для выканання пачэснай місіі, звязанай з падрыхтоўкай каравая, запрашалі жанчын, якія былі паважанымі і шчаслівымі ў сямейным жыцці: *«Каравай, канешні, пяклі, якая-небудзь жэншчына, каторая шчастліва была»* (зап. ад А. М. Сявуцкай у г. Гомелі); *«Но абязацельна жэншчына, каторая лепіць каравай, павінна быць замужам, не ўдавой»* (зап. ад А. К. Карпінскай у г. Гомелі); *«Каравай далжны былі пячы дзве-тры жанчыны, у якіх у сям'і згода, адзяваліся ва ўсё чыстае, пяклі, спявалі, прыгаворвалі: "Расці, расці, каравай, / Маладым шчасце-долю давай"»* (зап. ад К. Ц. Рабыкінай у г. Гомелі). На пытанне, чаму нельга было бацькам рыхтаваць каравай, атрыманы наступны адказ: *«Каравай пекли не родители, говорили, что будет печаль»* (зап. у г. Гомелі ад Галіны Паўлаўны Ганчаровай, 1929 г. н., пражывала ў в. Дзербічы Буда-Кашалёўскага р-на).

Паводле ўспамінаў Ніны Пятроўны Конухавай, перад тым як вынесці каравай, пыталі дазволу ў бацькоў: *«Ти есть отец и мать, разрешите каравай вносить. Ставили возле молодых, резали на дольки, звали родителей»* (зап. у г. Гомелі). Кожная з дзяўчат-дружак імкнулася схапіць кавалак каравая, што сімвалізавала замужжа ў будучым: *«Каравай вносили на голове, каждая девка старалась ухватить кусок, чтоб выйти замуж»* (зап. ад Н. П. Конухавай у г. Гомелі).

Дзяльба каравая як важны кульмінацыйны момант у беларускім вяселлі суправаджалася шматлікімі пажаданнямі, у якіх знайшлі адлюстраванне народная мудрасць, маральна-этычныя нормы: *«Дарую сруб, каб нарадзіўся лесаруб», «Дарым мёда бочку, каб нарадзілі сына й дочку»*; *«Дарую пару галубоў, каб была верная любоў»*; *«Дарую пару парасят, каб нарадзілі блізнят»* (зап. ад К. Ц. Рабыкінай у г. Гомелі); *«Сколько в лесу пеньков, чтоб столько было сынков. Сколько в лесу почек, чтоб столько было дочек. Бульбы подполье и детей застолье»* (зап. ад Н. П. Конухавай у г. Гомелі).

Устойліва захоўваюцца ў памяці жыхароў горада Гомеля звесткі пра такі старадаўні абрадавы этап вяселля беларусаў, як пасад, з якім таксама былі звязаны шчасце і дабрабыт маладых, змена іх статусу, напрыклад, сімвалічны перавод дзяўчыны ў жаноцкі стан. З гэтай мэтай адбываліся пэўныя маніпуляцыі з валасамі («падстрыганне і падпальванне»), пакрыванне кавалкам палатна або хусткай галавы маладой: *«Две подружки молодой расчёсывают её, заплетают волосы и одевают на голову платок, завязывают его под бороду обязательно. Так как она уже будет бабой и, конечно, поют жалосные песни, а молодая плачет. Да ещё молодую садят на*

*кут стола на кожух, это значит, чтобы она была богата и жила в достатке, и она сидит всё время за столом на кожуху»* (зап. ад Варвары Пятроўны Коваль, 1924 г. н., у г. Гомелі).

Устойлівасцю бытавання адрозніваюцца вясельныя прыкметы і павер'і, семантыка якіх звязана найперш з «магіяй першага дня» (У. А. Васілевіч). У сувязі з гэтым заслугоўвае ўвагі выказванне беларускага фалькларыста У. А. Васілевіча: «Пачатак стварэння новае сям'і ўяўлялі тым самым магічным вытокам, які трэба аберагаць паводле ўсіх правілаў народнае этыкі і светаўспрымання. Падобна на тое, як у народзе шануецца, ахоўваецца кожная крыніца, якая, прайшоўшы праз зямныя пласты, выходзіць на паверхню ў крыштальнай чысціні і набывае, як верылі, магічную, гаючую сілу, так і павер'е, атрыманае ў спадчыну ад папярэдніх пакаленняў, калі прыпадае на пачатак адмысловай падзеі, таксама аберагаецца і абавязкова выконваецца, каб не сапсавалася наступнае развіццё справы» [3, с. 9].

Што да народных вераванняў жыхароў горада Гомеля, то варта прывесці наступныя ўзоры прыкмет і павер'яў, якіх прытрымліваліся ў народзе не толькі ў найбольш адказных жыццёвых момантах, але і ў звычайных сітуацыях, бо надзвычай важнай была ідэя працягу роду. Гэтым і абумоўлена семантыка розных сімвалічных дзеянняў, скіраваных на забеспячэнне трывалай сям'і маладых, дзетанараджэння, дабрабыту, на захаванне гармоніі ў жыцці і прыродзе: *«Кавалачак караваю бралі чыстай хустачкай, каб маладыя былі багатыя, голай рукой нельга было браць»* (зап. ад К. Ц. Рабыкінай у г. Гомелі); *«Когда жених забирает невесту из дома, она, уходя, должна зацепить ногой все половики и тащить их до самого порога, чтобы младшие сёстры или подружки скорее вышли замуж»*; *«На скамью, где сидят молодые, кладут шубу, чтоб жизнь была богатая»* (зап. у г. Гомелі ад Любові Аляксандраўны Жалабковай, 1949 г. н., пражывала ў в. Вайцін Гомельскага р-на); *«Пасля караваю вынасілі "ельца", збіралася многа маладых дзяўчат, і кожная хацела ўхапіць самы прыгожы цвяток, асобенна вярхушку. Лічылі, хто сарве вярхушку, тая раней пойдзе замуж»* (зап. ад А. К. Карпінскай у г. Гомелі).

Калі адбывалася вяселле ў хаце маладога, то, зыходзячы з народных вераванняў, пасля таго, як ужо прайшло вясельнае застолле, *«потом веником выгоняли всех, чтоб невеста не вернулась домой и жила с мужем»* (зап. ад Н. Д. Кальковай у г. Гомелі).

У апісаннях вясельнай абраднасці горада Гомеля даволі маляўніча прадстаўлена паслявясельная частка. Праведзены аналіз фактычных

матэрыялаў дазволіў выявіць цікавыя факты мясцовага вар’іравання яе назваў, а таксама сімвалічных абрадавых дзеянняў, якімі суправаджалася цырымонія наведвання гасцямі хаты бацькоў маладой, маладога, іншых удзельнікаў вяселля. Сярод назваў паслявясельнага перыяду вылучаюцца наступныя: «драць курэй» (*«На трэці дзень дралі курэй, пераапраналіся ў цыганак, бабы ў мужыкоў пераапраналіся»* – зап. ад К. Ц. Рабыкінай у г. Гомелі; *«На трэці дзень было жартоўнае вяселле. Гэта хадзілі па вёсцы, бралі або кралі петухоў у тых, хто гуляў на вяселлі. Называлася гэта “драць курэй”»* – зап. у г. Гомелі ад Праскоўі Емяльянаўны Кошчанка, 1937 г. н., пражывала ў в. Дзяражычы Лоеўскага р-на Гомельскай вобл.); «гнаць курэй» (*«Гуляли три дня, а на третий курей гнали. Обычай такой был, что каждый приходил на свадьбу и обязательно приносил курицу»* – зап. ад Клаўдзіі Мікалаеўны Любінай, 1937 г. н., у г. Гомелі); «перегулы» (*«Невестина родня гуляет у жениха первый день, а на второй день у невесты вся родня жениха. Проходят эти два дня, опять собираются у жениха с обоих сторон родня. Гулянье продолжается целую неделю, а то и больше. Это называется “перегулы”»* – зап. у г. Гомелі ад Аляксандра Канстанцінавіча Каляпіна, 1935 г. н., пражываў у в. Міхайлаўка Шаткаўскага р-на Ніжагародскай вобл.); «вадзіць бяседы», «пярэзвы» (*«На другі дзень свадзьбы вадзілі бяседы. Збіраліся ў нявесты маладыя, некалькі часоў былі ў нявесты, а пасля ішлі да кожнага з дружак і баяраў. І там ужо хадзілі на галавах. Вадзілі бяседы дня тры-чатыры. Пасля свадзьбы таксама былі пярэзвы ў наступную нядзелю. Родныя жаніха звалі да сябе родных нявесты»* – зап. ад А. К. Карпінскай у г. Гомелі).

Прыведзеныя матэрыялы сведчаць аб тым, што метадалогія і методыка цэласнага фальклорна-этнаграфічнага абследавання з’яўляецца важнай асновай рэгіянальна-лакальнага кірунку даследаванняў. Вясельная абраднасць – унікальны від мастацтва, які мае выразную агульнаэтнічную аснову і ўяўляе сабой пэўную сістэму рэгіянальна-лакальных традыцый. У гарадскім вясельным абрадавым комплексе арганічна паяднаны лакальныя традыцыі Гомельшчыны, а таксама іншых усходнеславянскіх народаў, што і дае падставы сцвярджаць факт выяўлення спецыфічна адметных асаблівасцей, характэрных для асобных абрадавых этапаў вяселля і звязаных з імі рытуалаў, прыкмет і павер’яў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2006. – Т. 2. Лабараторыя традыцыйнага мастацтва – «Яшчур». – 832 с.

2. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2005. – Т. 1. Акапэла – Куцця. – 768 с.

3. Жыцця адвечны лад. Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2 / уклад., прадм. і перакл. У. Васілевіча. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1998. – 607 с.

РЕЗЮМЕ

В статье охарактеризованы отдельные обрядовые этапы досвадебного и собственно свадебного периодов, а также выявлены отличительные местные особенности послесвадебной части, что нашло подтверждение в этнографических описаниях информантов.

Внимание сосредоточено также на народных верованиях, характерных для разных обрядовых этапов. Приведены интересные примеры примет и поверий, содержание которых позволяет осмыслить глубину и поэтичность восприятия предками окружающей среды. Научную ценность представляют фольклорно-этнографические материалы, которые впервые вводятся в научный оборот.

SUMMARY

The article focuses on the ceremonial stages of the pre-wedding and the wedding periodand it shows the local peculiarities of the post-wedding part that has been proved by the vivid ethnographic descriptions provided by the informants.

Attention is focused on folk beliefs connected with different ritual stages and reflected in omens and beliefs, the content of which helps us to understand the depth and poetry of our ancestors' world outlook. Scientific value is connected with the folklore and ethnographic materials, which are introduced in a scientific way for the first time.

***Паборцава К. В.***

## МІФАЛАГІЧНАЯ ПРОЗА ВЕТКАЎСКАГА РАЁНА: МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА НАРОДНЫХ ВЕРАВАННЯЎ

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*

*(Паступіў у рэдакцыю 10.03.2022)*

У сістэме сучаснай духоўнай культуры беларусаў, у тым ліку жыхароў Гомельшчыны, важнае месца займаюць народныя вераванні, звязаныя з вобразамі народнай дэманалогіі. Мэта артыкула – выявіць лакальную спецыфіку бытавання міфалагічных апавяданняў пра персанажы ніжэйшай міфалогіі ў народнай памяці жыхароў Веткаўскага раёна. Аб'ектам вывучэння з'яўляюцца тэксты міфалагічнай прозы (апублікаваныя і архіўныя), запісаныя на тэрыторыі Веткаўскага раёна. Прадмет даследавання складаюць семантыка вобразаў ніжэйшага міфалагічнага ўзроўню і звязаныя з імі матывы, мікраматывы, а таксама рэгіянальна-лакальныя асаблівасці праявы народных вераванняў. Методыка даследавання вызначаецца